# СМАКІ «НОВАЙ ЗЯМЛІ»

**СКІДЗЕЛЬ.** У Скідзельскай гарадской бібліятэцы ў рамках рэспубліканскай акцыі для пажылых людзей “Ад усёй душы” і абласнога бібліятэчнага праекта “Разам з кнігай дарогай дабрыні” адбылося мерапрыемства ў фармаце “Бібліякафэ”.

За кніжна-чайным сталом сабраліся чытачы беларускай класікі, якіх прывабіла афіша з радкамі Якуба Коласа: “…Якія матчыны намеры наконт куцці, наконт вячэры?”. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі, бібліятэкар Тамара Мазур прачытала ўголас “смачныя” ўрыўкі пра традыцыйную беларускую ежу і застоллі з паэмы “Новая зямля”. У прыватнасці, пра штодзённую ежу ў частцы “За сталом” і спробу вынайсці новы рэцэпт у гумарыстычнай частцы “Дзядзька-кухар”, пра “мядовае” застолле ў “Падглядзе пчол” і багацце святочнай вячэры ў частцы “Каляды”.

Пасля кожнага ўрыўка абмяркоўвалася згаданая ежа, і ўспаміналіся забытыя рэцэпты, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Чытачы прыйшлі да высновы, што многія стравы сёння немагчыма прыгатаваць так, як некалі ў цаглянай печы, таму яны і забытыя. Аднак ёсць шмат іншых, смачных і карысных, толькі яны, на жаль, выцясняюцца прадуктамі з хімічнымі ўзмацняльнікамі смаку.

Разнастаілі мерыпрыемства кіраўнікі скідзельскіх школьных музеяў. Марына Аляксееўна Вабішчэвіч з СШ №3 прэзентавала навагоднія паштоўкі з уласнай калекцыі і расказала шмат цікавага пра іх гісторыю. Алена Аляксееўна Кавальчук з СШ №2 накрыла стол з калляднымі поснымі стравамі ды жытнімі сцяблінамі пад абрусам і правяла майстар-клас па народнай варажбе.



Напрыканцы своеасаблівай “беларускай гастранамічнай экскурсіі” па старонках добрай кнігі бібліятэкар прачытала свой уласны верш “Дранікі”. Дапамогу ў падрыхтоўцы дадзенага мерапрыемства аказалі юныя кнігалюбы Аліна Галенеўская і Дар’я Чэбатар. Дзяўчынкі з

любоўю зрабілі закладкі для шасці розных выданняў паэмы “Новая зямля”, каб кожны слухач мог лёгка знайсці абраныя радкі.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** у Скідзельскай гарадской бібліятэцы ў межах рэспубліканскай акцыі для пажылых людзей “Ад усёй душы” і абласнога бібліятэчнага праекта “Разам з кнігай дарогай дабрыні” адбыўся літаратурна-гастранамічны тур па паэме Якуба Коласа “Новая зямля”. Снежань 2025 года.











TESS
ORANGE


ШКОЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА
ЯКУБ КОЛАС
НОВАЯ ЗЯМЛЯ
паэма
ВЫДАВЕЦТВА «НАРОДНАЯ АСВЕТА»
МІНСК 1975